№ 3 (I9) САКАВІК 1990

ХРЫСЬЦІЯНСКІЯ НАВІНЫ

RADIO VATICANA
Ufficio Propaganda
00120 CITTÀ DEL VATICANO

БЕЛАРУСКІ ІНФАРМАТАР

адказны за бюлетэнь
Янка Мойсік

## РОДНАЯ МОВА Ў СЬВЯТЫНЯХ (ч.5)

Др. ВІКТАР СЕНКЕВІЧ

Дарагія чытачы! Працягваем аналіз працы ксяндза Адама Станкевіча "Родная мова ў сьвятынях", якая была выдадзеная ў Вільні ў I929 годзе. Перадаём зьмест III разьдзелу гэтае кнігі, азагалоўленага: "Родная мова ў сьвятынях і Сьвятое Пісаньне".

"Сьвятое Пісаньне- кажа аўтар- гэта кнігі напісаныя спрадвеку з Божага натхненьня. Кнігі гэтыя падаюць чалавеку бяспамылковую, праўдзівую навуку аб тым, як чалавек мае жыць, у што мае верыць, каб асягнуць сваю канчатковую мэту- Бога. Перахаваць чыстай навуку Сьвятога Пісаньня і падаваць яе бяспамылкова людзям, з волі Хрыста належыць да сьвятой Каталіцкай Царквы. Таму прыглядзімся сьпярша, што кажуць нам пра родную мову ў сьвятынях сьвятыя кнігі, напісаныя да прыходу Хрыста, а якія завуцца Старым Законам або Запаветам.

Гэтак, у псальмах, ці псаломах, як хочаце, сустракаем гарачы заклік да ўсіх краёў, да ўсіх народаў, за зямлі ўсяе служыць Богу, аддаваць Яму чэсьць і праслаўляць Яго. У кнізе прарока Ісаіі спатыкаем прароцтвы аб тым, што народы прыдуць да Хрыста, як да Збаўцы свайго і будуць служыць Яму верна. "Уся зямля няхай табе кланяецца і няхай пяе табе, няхай псальм пяе твайму імені".(Псальм 65,4) "Слаўце Госпада ўсе краі, слаўце яго ўсе народы".(Псальм II6,I) "І будуць яму пакланяцца ўсе валадары, усе народы служыць яму будуць" (Псалом 7I,II). "І пойдуць шматлікія народы і скажуць: ідзем і ўступім на гару Госпада Бога Якубавага і навуча нас дарог сваіх і хадзіць будзем дарогамі яго".(Іс.2,3)

Тыя-ж самыя думкі аб роднай мове ў набажэнстве, што і ў Старым Запавеце, толькі ўжо шмат выразьней, сустракаем мы ў кнігах Новага Запавету. Гэтак, напрыклад, у Эвангэльлях чытаем:

"Дык ідзеце, навучайце ўсе народы, хрысьцячы іх у імя Айца, і Сына,
і Сьвятога Духа"(матэй 28). "І сказаў ім: ідзеце па ўсім сьвеце і абвя-
шчайце Эвангэльле ўсякаму стварэньню" (Марк І6,І5). "Каб у імя Ісуса
хілілася ўсякае калена: нябесных, зямных і падземных і каб усякая мова
вызывала, што Госпад- Ісус Хрыстос у славу Бога Айца (Філіп. 2,І0-ІІ).
"Дзе няма грэка і юдэя, абрэзаныя і неабрэзаныя, барабара, скіфа, раба,
свабоднага, але ўсё і ўва ўсім Хрыстос" (Кал.3,ІІ) "Калі трываеце ў
веры цьвёрда і непарушна і не адпадаеце ад надзеі Эвангэльля, якое вы
чулі, якое абвяшчаецца ўсяму стварэньню пад небам якога я, Паўла, слуга"
(Кал. І,23)

А як прыгожа- адзначае айцец Адам Станкевіч у сваёй працы- і выразна
аб роднай мове ў набажэнстве гаворыць кніга Апакаліпсіс сьвятога Яна:
"І пялі песьню новую, кажучы: годны ёсьць, Госпаду, ўзяць кнігу і адчы-
ніць пячаці яе, бо ёсьць ты забіты і адкупіў нас Богу праз кроў тваю- з
усяго пакаленьня і мовы, і плямёнаў, і народаў" (Апак. 5,9)."І сказаў:
мусіш ізноў прарочыць плямёнам і народам, і мовам, і валадарам многім"
Нямала кажуць нам таксама аб роднай мове ў сьвятыні "Апостальскія Дзеяньні", якія апісваюць нам Зыход на Апосталаў Сьвятога Духа і надзяленьне
іх дарамі прамаўляць няведамымі ім дагэтуль мовамі: "І напоўніліся ўсе
Духам Сьвятым, ды пачалі гаварыць іншымі мовамі, паводле таго, як даваў
ім прамаўляць Дух Сьвяты. Былі-ж у Ерузаліме жыды, мужы пабожныя, з усякага народу пад небам. Калі пачуўся гук гэты, зыйшоўся народ дык устрывожыўся: бо кожны чуў, што яны гавораць ягонай мовай"(Апо. Дзеян.4,4-6).
"А калі Павал усклаў на іх рукі, зыйшоў на іх Дух Сьвяты, і пачалі гаварыць мовамі і прарочыць" (Ап.Дзеян І9,6)

Ужо з гэтых слоў Сьвятога Пісаньня, якія так заклікаюць усе народы
да Бога, і якія прарочаць, што і тыя народы, што Бога не знаюць, прыйдуць
да Яго і паклоняцца Яму, выразна бачым, што кожны народ у сваім рэлігійным жыцьці мае права карыстацца сваёй роднай мовай... Праслаўляць Бога
і лепш пазнаваць Яго, ды маліцца да Яго, жыць сапраўды жыцьцём Божым,
апавяшчаць Бога другім- можна толькі карыстаючыся роднай зразумелай мовай"

Аўтар кнігі "Родная мова ў сьвятынях" закрывае ІІІ разьдзел свае
працы цытуючы амаль поўнасьцю І4 разьдзел з Першага Пасланьня Сьвятога
Апостала Паўла да Карынцянаў, у якім Апостал шырока і глыбока тлумачыць,
якое месца і значэньне мае родная мова ў навучаньні слова Божага і наагул у жыцьці чалавека і народаў. Мы падамо толькі некалькі ўрыўкаў з
гэтага разьдзелу. Вось яны: "Рупіцеся пра любоў; старайцеся пра духоўнае,
асабліва-ж пра тое, каб прарочыць. Бо, хто гаворыць (незнаёмаю) мовай,
той гаворыць ня людзям, а Богу; бо ніхто ня чуе, і ён таёмнае духам гаворыць... Гэтак і вы, калі моваю даецё незразумелыя словы, дык як пазнаюць,
што вы кажаце? Вы будзеце гаварыць на вецер... Бо, калі я малюся ў незнаёмай мове, дык дух мой моліцца, але розум мой застаецца бясплодным...
Гэтак, браты, старайцеся прарочыць, дый не забараняйце гаварыць мовамі.
Няхай ўсё адбываецца прыстойна і паводле парадку".

"З усяго раней сказанага бачым,- заключае айцец Адам Станкевіч,- як
адна з крыніцаў нашага духоўнага жыцьця- Сьвятое Пісаньне- навучае нас
аб карыстаньні роднае мовы кожнага народу".

## ХРОНІКА

(Люты)

### І. ДЗЕЙНАСЬЦЬ СЬВЯЦЕЙШАГА АЙЦА

У месяцы лютым Ян Павал ІІ меў у Ватыкане кожнае серады тыдня сваю
агульную аўдыенцыю. Вось тэмы яго разважаньняў:

4 02 Працягваў разважаньне на тэму сьвятарскай адукацыі.
ІІ 02 Гаварыў аб ролі Марыі ў жыцьці сьвятара.
І8 02 Разважаў на тэму ідэалу сьвятара.
25 02 Гаварыў на тэму значэньня супольніцкага духа і супрацоўніцтва ў сьвятарскай паслузе.

Кожнай нядзелі лютага Яго Сьвятасьць гаварыў разам з вернікамі Багародзічную малітву "Анёл Гасподні", якую заўсёды папярэджваў прамовамі:

7 02 Падсумаваў свой душпастырскі візіт на афрыканскім кантынэнце.
І4 02 Гаварыў аб Прарочым дзеяньні Божага Духа.
2І 02 "Асьвячаючае дзеяньне Божага Духа".
28 02 "Абнаўляючае дзеяньне Божага Духа ў ачышчаньні сэрцаў".

### ІІ. ГУТАРКІ І ВЕСТКІ.

У лютым мы адзначылі наступныя гадавіны:
- І00 годзе з дня нараджэньня Казімера Сваяка-- аднаго з найбольш вядомых беларускіх паэтаў пачатку 20-х гадоў, правадыра нацыянальнага рамантызму ў беларускай літаратуры.
- І00 годдзе з дня нараджэньня Аляксандра Стагановіча- беларускага палітычнага і грамадскага дзеяча.
- І00 годдзе з дня нараджэньня беларускай паэткі Наталіі Вішнеўскай.
- І00 годдзе з дня нараджэньня беларускага паэта Пятра Хатулёва.
- І00 годдзе з дня нараджэньня беларускага паэта Янкі Гароха.

Важнейшыя гутаркі і паведамленьні:
- Аб візіце кардынала Казаролі на Венгры (7-І2 люты)
- Абануляваньні ў Румыніі дэкрэту з І сьнежня І948 году, паводле якога камуністычны рэжым сілаю прылучыў румынскую грэка-каталіцкую Царкву да Праваслаўнае Царквы.
- Аб І0 гадавіне візіту Яна Паўла ІІ ў Ватыканскім Радыё.
- Аб Пятай Сэсіі Агульнай Рады Цэркваў Бліжкага Усходу на Кіпры (22-29)
- Аб зьверненьні ўкраінскім уніятам катэдры ў Іванафранкоўску.
- Месячны намер малітвы Сьвяцейшага Айца на люты І990 году: "За хрысьціян, якія ў шматлікіх кутках сьвету прасьледуюцца".
- Аб ініцыятывах тэалагічнага дыялогу паміж каталіцкаю а праваслаўнаю Цэрвамі.

- Аб назначэньні айца Яна Гіркі біскупам Ўніяцкай Царквы на Славаччыне.
- Аб візіце арцыбіскупа Бостону кардынала Лёва на Кубе.
- Аб паялічэньні пакліканьняў да законнага жыцьця ў СССР.
- Аб выданьні папскага гадавіка "Аннуарыё Понтыфічыё" на 1990 год.

## 72 ГАДАВІНА АБВЕШЧАНЬНЯ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ БЕЛАРУСІ

"... Цяпер мы, Рада БНР, скідаем з роднага краю апошняе ярмо дзяржаўнае незалежнасьці, якая была накінута расейскім царызмам на наш вольны і незалежны край.

Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнай і вольнай дзяржавай. Самі народы Беларусі, у асобе свайго Устаноўчага Сойму, пастановяць аб будучых дзяржаўных зьвязях Беларусі".

Гэтыя словы былі сказаныя 72 гады таму Радай Беларускай Народнай Рэспублікі ў Менску 25 сакавіка 1918 году ў ейнай трэцяй грамаце, ведамай пад назвай Акту 25 Сакавіка. Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, як законны сувэрэнны орган беларускага народу, словамі гэтымі абвесьціла вольнасьць і дзяржаўную незалежнасьць Беларусі ды парвала ўсякія дзяржаўныя сувязі з Расеяй, часткай якой была дагэтуль Беларусь. Такім чынам на развалінах гістарычнае турмы народаў- царскае Расеі, побач з многімі народамі, ёю паняволенымі, ў гэты гістарычны 1918 год паўстаў да вольнага і незалежнага дзяржаўнага жыцьця і беларускі народ.

Акту 25 Сакавіка ня суджана было зьдзейсьніцца. Бальшавікі, якія перанялі ў спадчыне імпэрыялістычную і русыфікатарскую палітыку царскае Расеі, адразу-ж, з самага пачатку ўсёй сваей жорсткасьцю фізычнае сілы сталі ўпоперак дарогі незалежніцкіх імкненьняў беларускага народу. Савецкая-ж прапаганда, хвальшуючы гістарычную праўду, цьвердзіць, што БНР і ўвесь нацыянальна-незалежніцкі рух, што вакол яе разьвіваўся-- гэта справа адно невялічкай кучкі беларускіх нацыяналістаў, якія, стаўшы на службу рэакцыі, мясцовай буржуазіі, міжнароднага капіталу і замежнай інтэрвэнцыі, імкнуліся пры помачы БНР адарваць Беларусь ад савецкай дзяржавы і падпарадкаваць яе сілам замежнага капіталу.

Праўда аднак зусім іншая. Бясспрэчным бо фактам ёсьць тое, што тварцом і пазьнейшым абаронцам Акту 25 Сакавіка быў якраз сам беларускі народ, што ідэі беларускае дзяржаўнасьці зьяўляюцца неадлучнай арганічнай часткай ягоных духоўных імкненьняў. Пацьвярджаецца гэта шматлікімі мамэнтамі, найважнейшымі з якіх ёсьць наступныя:

Акт 25 Сакавіка 1918 году, якім абвяшчалася аб разрыве дзяржаўных сувязяў з Расеяй і праклямавалася дзяржаўная незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі, быў выражэньнем вольнае волі беларускага народу, быў актам, юрыдычная сіла якога бясспрэчная. Вялікая Беларуская Рада, якая задзіночвала тады ўсе беларускія нацыянальныя арганізацыі і палітычныя партыі, пастанавіла склікаць у Менску ў сьнежні 1917 году Першы Усебеларускі Кангрэс, складзены з выбраных дэмакратычным спосабам дэлегатаў беларускага народу з усіх этнаграфічных тэрыторыяў Беларусі. На Кангрэс зьехалася з усяе Беларусі 1.872 дэлегатаў, з якіх 1.167, што былі выбраныя насельніцтвам, мела права пастанаўляючага голасу, а толькі 703, што выбраных мандатаў ня мелі, карысталіся голасам дарадчым. У сваёй рэзалюцыі Кангрэс выказаўся за дзяржаўную незалежнасьць Беларусі. І хоць 30 сьнежня бальшавікі яго разагналі, фізычнай збройнай сілай, назаўтрае Кангрэс сабраўся ў поўным сваім складзе ў іншым месцы, дзе перадаў свае паўнамоцтвы аж да часу магчымых вольных выбараў у Беларусі абранай сваей Радзе. Вось-жа гэтая Рада Кангрэсу, перайменаваўшыся потым у Раду Беларускай Народнай Рэспублікі, ды абапіраючыся на дадзеныя ёй Кангрэсам неабмяжаваныя паўнамоцтвы, 25 сакавіка 1918 году абвясьціла Беларусь вольнай незалежнай дэмакратычнай рэспублікай і заявіла аб разрыве ўсякіх дзяржаўных сувязяў з Расеяй.

З гэтага бачым, што юрыдычная сіла Акту 25 Сакавіка ёсьць бясспрэчная, тым больш, што хутка пасьля гэтага шэсьць эўрапэйскіх дзяржаваў прызналі сувэрэннасьць Беларусі "дэ юрэ" і чатыры "дэ факто".

З першых дзён арганізацыі мясцовых органаў БНР беларускі народ ахвотна ім падапарадкаваўся, ўключыўся ў актыўнае з ім супрацоўніцтва і, што найважнейшае, масава выступіў на збройнае змаганьне ў абароне Беларускае Народнае Рэспублікі. Калі бальшавіцкая армія акупавала Беларусь, на ўсёй беларускай тэрыторыі пачалі ўспыхваць антыбальшавіцкія народныя паўстаньні. Некаторыя з іх насілі стыхійны характар, але многія, як напрыклад, Слуцкае паўстаньне 1920 году, вяліся арганізавана пад сьцягам беларускай дзяржаўнасьці і ставілі сабе за мэту ўстанаўленьне і абарону БНР.

Ідэя беларускай дзяржаўнай незалежнасьці сталася ад 1918 году ідэйнай асновай усяго беларускага нацыянальна-вызвольнага руху. У Беларускай ССР, створанай бальшавікамі ў процівагу Беларускай Народнай Рэспубліцы, увесь зпачатку да савецкага рэжыму беларускі нацыянальны рух аж да ягонае крывавае ліквідацыі ў 1930 годзе і наступных гадах, ставіў канчальнай сваей мэтай зьнішчэньне савецкага ладу і адбудову незалежнай Беларусі, што пацьвярджаюць і самі бальшавікі. Пад дзяржаўніцкім сьцягам БНР разьвівалася ўвесь час беларуская нацыянальная акцыя і ў Заходняй Беларусі, якая да 1939 году знаходзілася пад Польшчай. Ані тады, ані сёньня на эміграцыі нельга нават сабе ўявіць тэй ці іншай беларускай арганізацыі або партыі, тэй ці іншай беларускай дзейнасьці, ў аснову якіх ня былі б паложаныя ідэі дзяржаўнай незалежнасьці.

Такім чынам, ідэя дзяржаўнай незалежнасьці сталася арганічнай часткай душы беларускага народу, ягонай рухаючай сілай, ягоным натхненьнем і ягонай канчальнай мэтай. А ў гэтым ляжыць найбольшая зарука, што ідэя беларускай дзяржаўнай незалежнасьці, як і кожная вялікая і жывая ідэя, раней ці пазьней затрыўмфуе над сіламі накіданымі беларускаму народу хвальшывымі ідэямі і станецца дакананым фактам.

## СТАГОДДЗЕ З ДНЯ НАРАДЖЭНЬНЯ АЙЦА ЯЗЭПА ГЭРМАНОВІЧА!

Язэп Гэрмановіч, вядомы таксама пад псэўданінам Вінцука Адважнага, нарадзіўся 4 сакавіка 1890 году ў гарадку Гальшаны. Нягледзячы на вельмі цяжкія жыцьцёвыя ўмовы імкнуўся ён ужо з дзіцячых гадоў да навукі. Пачатковую школу закончыў у Гальшанах, маючы 12 гадоў. Навуку сваю працягваў у Ашмянах, дзе ўпершыню сутненуўся з беларускім друкаваным словам. Там ксёндз Гуневіч пазнаёміў маладога хлапца з "Дудкай беларускай" Францішка Багушэвіча. Ад тае пары малады Язэп Гэрмановіч становіцца не толькі сьвядомым беларусам, але і актыўным змагаром за лепшую долю свайго народу. Пасьля заканчэньня гарадской школы ў Ашмянах выбраўся ён у Вільнё, каб там далей адукавацца ў духоўнай сэмінарыі. Але перш чым быў ён туды прыняты, праз тры гады жыў у Вільні разам з Кастусём Стэповічам, пазьнейшым сьвятаром і паэтам, вядомым пад псэўданімам Казімера Сваяка. Хваробы ды разнастайныя жыцьцёвыя перашкоды не зьбіваюць юнакоў з выбранага імі шляху. Разам вучацца, здаюць экзамены і ўрэшце абодва прынятыя ў Віленскую Духоўную Сэмінарыю. Сэмінарыя гэтая знаходзілася тады пад загадамі Арцыбіскупа Роппа, вядомага са свае прыхільнасьці да беларускай справы і справы беларускай мовы ў сьвятынях. Аднак жа, з прычыны ягонай адсутнасьці ў Вільні і з прычыны пераваgi польскіх прафэсараў у сэмінарыі, дух у ёй быў не вельмі здаровы. Тым не менш аднак, выйшла з яе немалаважная колькасьць вядомых беларускіх сьвятароў, змагароў за справу беларускай мовы ў сьвятынях. Сябрамі Гэрмановіча ў Віленьскай Сэмінарыі былі: згаданы раней Стэповіч, Андрэй Цікота, Адам Станкевіч, Віктар Шутовіч, Вінцэсь Гадлеўскі, Аўгустыновіч, Пятроўскі, Міхась Борык, Цыпр Лазоўскі. Усе яны, як вядома, стаўшыся сьвятарамі папрацавалі нямала для беларускага духоўнага адраджэньня.

Віленскую духоўную сэмінарыю Язэп Гэрмановіч закончыў у 1913 годзе і з рук літоўскага біскупа Каросаса атрымаў сьвятарскія сьвядчыны. Першую сваю службу Божую адслужыў ён у касьцеле Сьвятога Духа ў Вільні, у часе якой асыставалі яму ягоныя сябры Кастусь Стэповіч і Адам Станкевіч. Сваю душпастырскую працу Язэп Гэрмановіч пачаў у Далістове Беластоцкага павету, ў характары вікарыя ксяндза Тыневіча. Пасьля году працы духоўныя ўлады пераносяць яго ў Беласток, а затым зноў у Далістова, адкуль далей трапляе ў Крыпна, Мсцібова, а ў 1919 годзе ў Вялікую Лапеніцу.

Там, акрамя звычайнай працы, адкрывае ён беларускую школу, аднак жа, неўзабаве палякі прымушаюць яго пакінуць Вялікую Лапеніцу і ў 1920 годзе Язэп Гэрмановіч пераязджае ў Луконіцу, што ў Слонімскім павеце. У тым самым годзе, летам, прыходзяць туды бальшавікі, якія не маюць зьлітаваньня ні над цяжка хворым Язэпам Гэрмановічам і арыштоўваюць яго. Дзякуючы, аднак, ахвярнай дапамозе парафіянаў і мясцовага насельніцтва, Язэп Гэрмановіч без шванку выходзіць з бальшавіцкіх рук і прабывае ў Луконіцы яшчэ тры гады.

Дзе б не працаваў, усюды Язэп Гэрмановіч навучае людзей праўдаў Божых у той мове, на якой яны гавораць. Факт гэты, які сам па сабе зусім зразумелы, ў тую пару патрабаваў вялікай адданасьці, геройства амаль. Польскім чыноўнікам, усялякага тыпу палячкам і спольшчаным беларусам такія дзеяньні Язэпа Гэрмановіча былі недаспадобы і выклікалі нагонку на яго.

У Шаркаўшчыне на паховінах вялікага беларускага каталіцкага сьвятара Зянона Якуця, Язэп Гэрмановіч гаварыў казаньне да вялікага людскога натоўпу, у прысутнасьці 11 каталіцкіх сьвятароў і 2 праваслаўных. Усе прысутныя тады глыбока ўзрушыліся шчырасьцю выказваньняў, яснасьцю рэлігійнай думкі і глыбокім нацыянальным пачуцьцём айца Язэпа Гэрмановіча.

З Луконіцы айца Гэрмановіча перанясьлі ў Лужкі, дзе працаваў усяго год часу, бо ў 1924 годзе ўступіў ён у закон Айцоў Марыянаў, якія ў тым часе пачыналі сваю беларускую галіну ў Друі над Дзьвіной. У Друі невялікая грамада Марыянаў, сярод якіх вылучаліся айцы Фабіян Абрантовіч і Андрэй Цікота, кіравала вялікай парафіяй, каэдукацыйнай гімназіяй і дапамагала ў суседніх парафіях. Язэп Гэрмановіч, закончыўшы навіцыят, быў назначаны пробашчам у Друі, а пасьля магістрам навіцыяту і настаўнікам закону Божага і лацінскай мовы ў гімназіі. Беларускім марыянам не давялося працаваць доўга, бо ў 1928 годзе выязджае ў Харбін, на цяжкую працу сярод расейцаў, Фабіян Абрантовіч, а чатыры гады пазьней яму на дапамогу выязджае і Язэп Гэрмановіч.

У Харбіне, хаця і ўмовы працы былі куды цяжэйшымі, чым у Друі, то айцу Гэрмановічу давялося выконваць галоўным чынам тое ж самае, гэта значыць выхоўваць моладзь. Выконваў ён абавязкі дырэктара гімназіі, спаведніка жаночых манастыроў, выхаваўцы інтэрнату і настаўніка.

У 1936 годзе Язэп Гэрмановіч вяртаецца ў Вільню, дзе быў назначаны кіраўніком беларускага марыянскага Студэнцкага Дому. Мэтаю гэтага Дому был падрыхтаваньне будучых сьвятароў. Няраз пабывалі ў ім беларускія сьвятар дзеячы, мастакі і паэты. Пабывалі там Антон Луцкевіч, Трэпка, Максім Тан Забэйда Суміцкі. Віленскі беларускі дом Айцоў Марыянаў быў сапраўдным асяродкам беларускага духоўнага адраджэньня. Праіснаваў, аднак, усяго тры гады. Польскія адміністрацыйныя ўлады зьнішчылі беларускі кляштар у Друі і не далі аніякага шанцу на існаваньне таксама ж і Віленскаму Дому. Усе студэнты і айцец Гэрмановіч у 1938 годзе былі выселеныя ў цэнтральную Польшчу. Адтуль Язэп Гэрмановіч падаўся ў Рым, а пазьней зноў у Харбін, дзе сустрэўся з Абрантовічам, і пасьля з Андрэям Цікотам. У Харбіне

працуе ён да 1948 году, калі то кітайскія камуністы яго арыштавалі разам з іншымі айцамі і настаўнікамі і перадалі ў рукі савецкаму НКВД. Падобна як і іншыя, Язэп Гэрмановіч быў прысуджаны на 25 гадоў прымусовых лагерных работ. Свой лёс у савецкіх лагерах і турмах Язэп Гэрмановіч апісаў ва ўспамінах азагалоўленых: "Кітай- Сібір- Масква", кнізе, якая была перакладзеная на польскую, літоўскую і італьянскую мовы.

Пасьля сьмерці Сталіна, савецкія ўлады дазваляюць выехаць айцу Гэрмановічу ў Польшчу у 1955 годзе, дзе і пачаў ён пісаць свае ўспаміны. У 1959 годзе, пасьля доўгіх стараньняў удалося яму выехаць у Рым, дзе і адчыніўся перад ім шырокі сьвет. Пабываў у ЗША, меў намер наведаць Аўстралію і Новую Зэляндыю. Апошняй ягонай жыцьцёвай прыстаню быў Дом беларускіх айцоў Марыянаў у Лондане. Памёр айцец Язэп Гэрмановіч 26 сьнежня 1978 году. Паховіны адбыліся 8 студзеня 1979 году пры ўдзеле шматлікага беларускага духавенства і вернікаў.

Сваю літаратурную дзейнасьць Язэп Гэрмановіч пачаў будучы пробашчам у Вялікай Лапеніцы. Першы ягоны артыкул быў надрукаваны ў Віленскім часопісе "Крыніца" у 1919 годзе. Своечасова да пісаньня заахвочваў яго Максім Гарэцкі. І Язэп Гэрмановіч- ён жа Вінцук Адважны- пісаў, дзе быў і дзе толькі мог. Ягоная творчасьць адзначаецца глыбокім патрыятызмам і рэлігійнасьцю. Стаіць ён на грунце несьмяротных ідэалаў Хрыстовае рэлігіі і навучаньня. З ідэалаў гэтых браў ён паэтычнае натхненьне і да іх заклікаў беларускі народ, бо ў іх бачыў таксама зьдзяйсьненьне беларускіх нацыянальных імкненьняў. Справа нацыянальная ў Вінцука Адважнага гэта частка Божае справы. На жаль, шмат ягоных твораў загінула, у тым ліку арыгінальныя байкі, тлумачэньні і іншае. Прыкладова ўсё тое, што напісаў айцец Гэрмановіч у Харбіне там жа і асталося. Ягоныя "Успаміны" былі даручаны Папе Яну XXIII, які прымаючы яго на аўдыенцыі сказаў: "Не ўпадзі зноў у рукі ворагаў тваіх..".